# КНІГА ПРАРОКА АЎДЗЕЯ

1 Уява Аўдзею. Так кажа Гасподзь Бог пра Эдома:
вестку пачулі мы ад Госпада, і пасол пасланы
абвясьціць народам: «уставайце, і пойдзем супраць
яго вайною!»
2 Вось, Я зрабіў цябе малым сярод народаў, і ты ў
вялікай пагардзе.
3 Ганарыстасьць сэрца твайго падманула цябе; ты
жывеш у расколінах скал на ўзвышаным месцы і
кажаш у сэрцы тваім: «хто скіне мяне на зямлю?»
4 Але хоць бы ты, як арол, падняўся высока і сярод
зорак зладзіў гняздо тваё, дык і адтуль Я скіну цябе,
кажа Гасподзь.
5 Ці ня злодзеі прыходзілі да цябе, ці не начныя
рабаўнікі, што ты так абабраны? Але яны ўкралі
б столькі, колькі ім трэба. Калі б да цябе залезьлі
абіральнікі вінаграду, дык і яны ці ж бы не пакінулі
некалькіх ягадзін?
6 Як абабрана ўсё ў Ісава і абшуканы ўсе патайнікі
ягоныя!
7 Да мяжы выведуць цябе ўсе супольнікі твае,
ашукаюць цябе, адолеюць цябе тыя, што жывуць з
табою ў міры, ударацць цябе тыя, што хлеб твой ядуць.
Няма ў ім сэнсу!
8 Ці ня ў той дзень гэта будзе, кажа Гасподзь, калі Я
вынішчу мудрых у Эдоме і разумных на гары Ісава?
9 Працятыя будуць страхам адважнікі твае, Фэман,
каб усе на гары Ісава вынішчаны былі забойствам.
10 За ўціск брата твайго, Якава, пакрые цябе сорам, і
ты зьнішчаны будзеш назаўсёды.

11 У той дзень, калі ты стаяў насупраць, у той
дзень, калі чужынцы вялі войска ягонае ў палон
і іншапляменцы ўвайшлі ў браму ягоную і кінулі
жэрабя на Ерусалім, ты быў як адзін зь іх.
12 Ня варта было б табе глядзець на дзень брата
твайго, на дзень адчужэньня яго; ня варта было б
радавацца за сыноў Юды ў дзень іхняй пагібелі і
разьзяўляць рот у дзень бедства.
13 Ня трэба было табе ўваходзіць у браму народу
Майго ў дзень няшчасьця яго і нават глядзець на
злашчасьце яго ў дзень пагібелі ягонай, ні дакранацца
да маёмасьці ягонай у дзень бедства ягонага.
14 Ні стаяць на ростанях, каб забіваць тых, што ўцякалі
ад яго, ні выдаваць ацалелых ад яго ў дзень бедства.
15 Бо блізкі дзень Гасподні на ўсе народы: як ты рабіў,
так будзе зроблена і з табою; аддача твая абернецца
на галаву тваю.
16 Бо як вы пілі на сьвятой гары Маёй, так усе народы
заўсёды піцьмуць, будуць піць, праглынуць і будуць -
як бы іх ня было.
17 А на гары Сіёне будзе збавеньне, і будзе яна
сьвятынямю; і дом Якава атрымае ва ўладаньне
спадчыну сваю.
18 І дом Якава будзе агнём і дом Язэпа - полымем, а
дом Ісава - саломаю: запаляць яго і зьнішчаць яго, і
нікога не застанецца з дому Ісава, бо Гасподзь сказаў
гэта.
19 І завалодаюць тыя, што на поўдзень, гарою Ісава,
а якія ў даліне - Філістымлянамі; і завалодаюць
полем Яфрэма і полем Самарыі, а Веньямін завалодае
Галаадам.
20 І пераселеныя з войска сыноў Ізраілевых
завалодаюць зямлёю Хананэйскаю да Сарэпты,
а пераселеныя зь Ерусаліма, якія ў Сэфарадзе,
атрымаюць у валоданьне гарады паўднёвыя.

21 І прыйдуць ратавальнікі на гару Сіён, каб судзіць гару Ісава, - і будзе царства Госпада.

# Біблія (пераклад В.Сёмухі)
# The Holy Bible in Belarusan
## Белорусское Новый Завет и Притчи

copyright © 2016 John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Language: Belarusian

Translation by: Antoni Bokun

Contributor: John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

This translation is made available to you under the terms of the Creative Commons Attribution-No Derivatives license 4.0.
You may share, redistribute, or adapt this Bible translation or extracts from it in any format, provided that:
You include the above copyright and source information.
You do not use this work for commercial purposes.
Pictures included with Scriptures and other documents on this site are licensed just for use with those Scriptures and documents. For other uses, please contact the respective copyright owners.

2019-12-29

---

PDF generated using Haiola and XeLaTeX on 21 Feb 2024 from source files dated 29 Jan 2022
5bafea06-5eb3-574c-9054-5e4b38c21bbc